***Маршрут пешы, 9 км, 1 дзень.***

11. Клясціцы – Верхнядзвінск (р. Нішча – р. Дрыса).

***Маршрут водны, 100 км, 5 дзён, начлегі: 1 – Старасекаў Двор, 2 – вусце р. Нішча (Кульнева), 3 – Буракова, 4 – Ахрэмцы.***

12. Сар'я – Верхнядзвінск (р. Сар'янка – р. Зах. Дзвіна).

***Маршрут водны, 30 км, 3 дні, начлег і днёўка на Шатроўскім востраве (з выхадам на месца Дрыскага вайсковага лагера).**** 

***** маршрут можа быць пачаты ад Зашчырына; выхад на ур. Бабы – месца стаянкі рэзерва рускіх войск; дадатковы начлег ля вусця Віранкі.

**Тэматычныя экскурсійныя аб'екты на маршрутах:**

*Верхнядзвінск* – помнік у гонар 100-годдзя перамогі ў Айчыннай вайне 1812 г.
*Філіпова* – поле бітвы 1812 г. ва ўр. Лазоўка
*Валынцы* – экспазіцыя музея І.Чэрскага аб вайне 1812 г.
*Сівошына* – помнікі на месцы гібелі генерала Я.Кульнева
*Клясціцы* – помнік у гонар перамогі ў Айчыннай вайне 1812 г.; школьны музей
*Бялькоўшчына* – месца ваеннай рады Аляксандра І
*Шатрова* – мясціны перапраў Дрыскага вайсковага лагера
*Дварчаны* – мясціны палявых умацаванняў Дрыскага вайсковага лагера
*Друя* – мемарыяльны знак у гонар падзей 1812 г.
*Расіца* – Друйскі тракт; месца базавання штаба і галоўных сіл Вітгенштэйна
*Ур. Пагост* – месца былой царквы з замураваным гарматным ядрам
*Ур. Забор'е* – магіла, дзе пахавана каля 1,5 тыс. французскіх ваяроў
*Ур. Пажарышча* – месца галоўнай бітвы ў ліпені 1812 г.
*Зара* – месца бітвы за пераправу праз Свольну
*Жоўтаўшчына* – месца бітвы за пераправу ў былой вёсцы Востры Канец
*Мёры* – экспазіцыі краязнаўчага музея аб падзеях 1812 г.
*Полацк* – помнікі і экспазіцыі краязнаўчага музея аб падзеях 1812 г.

**Галоўныя экскурсійныя аб'екты па пабочных тэмах:**

*Верхнядзвінск* – экспазіцыі музея СШ№2, старадаўнія пахаванні на могілках
*Каханавічы* – магіла І.Храпавіцкага, Святы ключ, клуб "Белыя вароны"
*Сар'я* – неагатычны храм, парк
*Расіца* – Траецкі касцёл, старадаўнія пахаванні на могілках, руіны царквы
*Лявонпаль* – палац І.Лапацінскага, музей радзімазнаўства, Калона
*Свольна* – помнік на месцы сядзібы І.Чэрскага
*Узмёны* – Свята-Мікалаеўская царква
*Клясціцы* – ГЭС на р. Нішча, мемарыяльныя могілкі савецкіх воінаў
*Мёры* – музей кнігі, Успенскі касцёл
*Кульнева* – гарадзішча Сокал
*Друя* – архітэктурныя помнікі, Барысаў камень, юдэйскія могілкі
*Ідолта* – помнікі архітэктуры
*Сар'янка* – агаленні дэвона, земляныя печы па выпальванні вапняку і інш.

**В.А. Ермалёнак**

## МЁРШЧЫНА Ў ВАЙНЕ 1812 ГОДА

Сучасны Мёрскі раён у пачатку ХІХ стагоддзя ўваходзіў у Дзісенскі, а заходняя яго частка – ў Браслаўскі павет. Роля Мёршчыны ў вайне была вызначана яшчэ перад вайной згодна плану, які быў распрацаваны ваенным саветнікам генерал-лейтэнантам К.Л. Фулем і зацверджаны Александрам 2. Згодна плану, рускія арміі павінны былі адразу адступаць, манеўраваць, пазбягаць генеральных бітваў да ўмацаванага лагеру, які павінен быў знаходзіцца на флангу наступаючых французскіх войск. Па даручэнню Барклая дэ Толі падпалкоўніку барону Вольцогену было даручана знайсці месца, зручнае для пабудовы ўмацаванага лагеру паміж Дняпром і Дзвіной. З чэрвеня па верасень Л.Вольцоген вывучаў вялікія прасторы: ад Рыгі да Дзісны. Шляхі Вільня – Дынабург – Дрыса, Вільня –



Рэпазіторый ВДУ

Мінск – Орша, Віцебск – Орша – Магілёў – Стары  Быхаў, Стары Быхаў – Бабруйск – Нясвіж – Слонім – Пружаны – Кобрын – Брэст; Брэст – Дубна – Жытомір – Кіеў. Толькі ў  кастрычніку ён вярнуўся зноў у Пецярбург. За гэты час  ён  дасылаў ваеннаму міністру падрабязныя апісанні дарог і пазіцый ля Рыгі, Вільні, Друі, Дрысы, Барысава, Дзінабурга, Віцебска, Оршы, Свенцян, Зэмбіна, Брэст – Літоўска, Будзілова і Магілёва, стан агледжаных ім крэпасцей і агульныя меркаванні аб будучым тэатры ваенных дзеянняў. Менавіта ён і выбраў найбольш зручнае месца для пабудовы лагера ў лукавіне ракі Дзвіна насупраць павятовага горада Дрыса, які павінен быў размясціцца якраз на тэрыторыі сучаснага  Мёрскага раёна. [8, с. 85]. Будаўнічыя працы пачаліся толькі ў красавіку 1812 года. Уся арганізацыя працы  будаўніцтва лагера была ўскладзена на палкоўніка Світы Яго Імператарскай вялікасці Эйхэна. Рабочай сілай павінен быў забяспечыць беларускі ваенны губернатар А. Вюртэмберскі. Ён распарадзіўся адправіць на будаўніцтва 2500 тысяч людзей з жалезнымі рыдлёўкамі, піламі, сякерамі. Дастаўку рабочых павіны былі забяспечыць засядацелі земскіх судоў. Частка рабочых уцякала ад знясільваючай працы і недахопу харчавання. Пры гэтым больш разбягалася з далёкіх паветаў: Вілейскага, Рэжыцкага, таму асноўны цяжар працы быў на пастаўку рабочых з нашага Дзісенскага, а таксама Дрысенскага паветаў, якія пасылалі не з кожных ста сялян, а з дваццаці – аднаго рэкрута. [6, с. 44]. Непасрэдна працы пачаліся 12 красавіка. На працягу двух месяцаў паўтары тысячы чалавек уручную насыпалі  11 рэдутаў, высеклі лес  паміж вёскамі Кукішы, Шчэберы, Слабада, пабудавалі з дрэваў засекі, і палісады – ўмацаванні з завостраных бярвенняў, укапаных у зямлю. Было пабудавана дзесяць батарэй, перад якімі былі равы, глыбінёй да двух і шырынёй  да шасці метраў. Найбольш марудна спачатку ішла  пабудова рэдутаў №3 і № 4 і егерскіх умацаванняў супраць іх, таму што спачатку там было многа вады, а таксама трэба было выкапаць шматлікія пні. Памеры лагеру склалі 4,3 кіламетры ў даўжыню і 3,2 кіламетры ў шырыню. Асноўныя яго рэдуты  размяшчаліся паміж вёскамі Брэдзева, Путры (Слабада) Шчэберы, Барсукі, Дварчаны. Кожны рэдут  першай  лініі  прыкрываўся ложэментам –акопам для  укрыцця пяхоты і гармат. Даўжыня іх складала  00-80 сажняў. Рэдуты другой лініі размяшчаліся на адлегласці 200-300 сажняў. Вышыня іх дасягала  4-5 метраў. Рэдуты другой лініі былі акружаны яшчэ “воўчымі ямамі”. З левага флангу, каб французы не маглі непрыкметна падыйсці, была створана засека з высечанага лесу, якая  складала ў даўжыню 2,5 кіламетры і такіх засек было тры лініі. [5, с. 281]. Акрамя таго, былі пабудаваны масты на рэках Заходняя Дзвіна, Дрыса, Дзісна, Друя. Для больш зручнага руху войск на Мёршчыне былі пабудаваны, або добраўпарадкаваны і пашыраны дарогі Браслаў – Перабродздзе – Мёры – Дзісна, Браслаў – Забалоцце – Мілашова – Лявонпаль – Дрыса, Друя – Лявонпаль – Дрыса. Пабудаваны невялікія масты на рэчках; Вята, Волта, Мёрыца. Пад час даследаванняў археолага-краязнаўчага гуртка былі знойдзены рэшткі мастоў на рацэ Вята, і Храброўка. Рэшткі прадмостнага ўмацавання і палі былі знойдзены намі ля вёскі Слабада. У пачатку чэрвеня працы па будаўніцтву Дрысенскага лагера агледзеў інжынер генерал-лейтэнант  К.І. Операман, які далажыў ваеннаму міністру, што будаўніцтва ўмацаванняў выканана Эйхенам з вялікім поспехам і рэкамендаваў яго, падпалкоўніка Нэйтгарда і інжынер-паручыка Класава ўзнагародзіць [4, с. 44]. Але час паказаў, што будаванне Дрысенскага лагера знясільваючай працай 2,5 тысячамі сялян было дарэмным.

24 чэрвеня 1812 года Напалеон з войскам пачаў пераправу праз Нёман. Згодна папярэдняга плана, 1-ая руская армія пад камандаваннем Барклая дэ Толі пачала адступаць да Дрысенскага лагера. Праз Мёршчыну праходзілі 1, 2, 3, 4, 5

Рэпазіторый ВДУ

пяхотныя карпусы і 1 кавалерыйскі карпус 1-й рускай арміі. За ёй паволі рухаліся чатыры французскія корпусы, Нансуці, Манбрэна, Грушы, Латур-Любура пад агульным камандаваннем маршала Мюрата. Па нашых дарогах праходзілі таксама корпусы Нэя і Удзіно. 8 ліпеня Аляксандр 1 агледзеў умацаванні. Вось, што пісаў аб гэтым у сваіх мемуарах "Дрысские записки" адмірал А.Шышкоў: "Рускі цар у складзе Аракчэева, Балашова, Фуля і вялікай світы агледзеў умацаванні. Фуль даваў тлумачэнні. Тут жа палкоўнік Мішо зрабіў некалькі заўваг Фулю, бо на яго погляд праціўніку нічога не каштавала, каб знішчыць усю рускую армію ў гэтым лагеры. Генерал Фуль ускіпеў і рэзка адказаў Мішо. Пад час спрэчкі Аляксандр дапытліва глядзеў на сваіх прыбліжаных, але ніхто не адважыўся падтрымаць Фуля. "На другі дзень знаходжання ў лагеры імператар склікаў ваенную раду, на якой акрамя Аракчэева, Балашова, прысутнічалі Барклай дэ Толі, генерал С.Валконскі, прынц Альдэнбургскі і генерал Вальцоген. Усе выказаліся за адступленне з лагера [2, с. 63–64]. Тут жа было вырашана ў сувязі з небяспекай знаходжання ў арміі і каб у будучых паражэннях не абвінавачвалі Аляксандра 1, яму было прапанавана пакінуць армію. Галоўнакамандуючым стаў Барклай дэ Толі. 9 ліпеня 1-ая руская армія заняла Дрысенскі ўмацаваны лагер. У гэты дзень спаўнялася 103 гадавіна Палтаўскай бітвы. Каб узняць маральны дух адступаючай арміі, быў зачытаны высачайшы ўказ .

1-я руская армія размясцілася ў Дрысенскім лагеры ў наступным баявым парадку: на правым флангу 2-гі корпус генерала Багавута, у цэнтры – 3-ці корпус М.Тучкова, на левым флангу 4-ты корпус Астэрман- Талстога. У авангардзе ля вёсак Пруднікі і Лявонпаль знаходзіўся корпус графа Вітгенштэйна, паміж Дрысай і Дзісной корпус Дахтурава [3 ,с, 126-127]. Іх раз'ездам была пастаўлена задача затрымаць праціўніка. Напалеон даведаўшыся, што руская армія знаходзіцца ў Дрысенскім лагеры аддаў загад Мюрату перайсці на правы бераг Дзвіны і акружыць Дрысу. Імператар спадзяваўся, што Барклай дэ Толі дасць бой і руская армія загіне ў пастцы. Але рускі галоўнакамандуючы аддаў загад Вітгенштэйну закрыць шлях на Пецярбург, а ўсёй рускай арміі адступаць у напрамку Полацка. Таму руская армія, прастаяўшы і адпачыўшы ў лагеры пяць дзён, 14 ліпеня пакінула ўмацаваны лагер і рушыла на ўсход. 15 ліпеня генерал Кульнёў даў бой французскай дывізіі пад камандаваннем Себасцьяні. Гродзенскія гусары атакавалі французаў нечакана на маршы паміж Друяй, Чэрневам і Казакова. Былі разбіты два кавалерыйскія палкі і ўзяты ў палон генерал Сен-Жэўе. Гэты бой заставіў Мюрата памылкова прыняць за сутычку з асноўнай арміяй рускіх і прыпыніць наступленне да падыходу ўсёй сваёй арміі. Толькі на чацвёрты дзень, як рускія пакінулі лагер, французскія войскі падступілі да яго. Вось што пісаў аб гэтым у сваіх успамінах "З Напалеонам у Расію" доктар Рос: "Пры няспынным руху да галоўных акопаў незвычайна высокіх і з вялікай колькасцю байніц, у многіх з нас сэрца забілася падвоеным і патроеным тэмпам. Чым бліжэй мы падыходзілі – тым цішэй рабілася – ні чуваць было ні бразгату зброі, ні пакашлівання, ні адзін конь не заіржаў. У кожнае імгненне мы чакалі грамавых залпаў з жэрлаў гармат гэтых акопаў. Раптам туман засцілаўшы нам вочы рассеяўся. Цішыня змянілася спачатку шэптам, а потым рогатам: за вялікімі акопамі не было ніводнай гарматы, ніводнага салдата. Наверсе хадзіў толькі нейкі мужычок, якога раней прынялі за салдата…" [1, с. 109]. Меліяратыўныя работы, праведзеныя ў 70-я гады 20 стагоддзя, зруйнавалі амаль цалкам гэты помнік ваеннай стратэгіі. Засталіся толькі прадмостныя ўмацаванні ля вёскі Слабада. У гэты час Мёршчына з'яўлялася арэнай невялікіх сутычак асобных атрадаў рускіх войск корпуса Вітгенштэйна і французскіх маршала Удзіно. 12 ліпеня па дарозе з Шаркаўшчыны на Дзісну ля



Рэпазіторый ВДУ

вёскі Каркаўшчына Елісаветградскі полк штаб-ротмістра Леантовіча разбіў пад час начнога бою французскі атрад і захапіў у палон 75 французаў. 15 ліпеня рота з шостага пяхотнага палка генерала Палена корпуса Дахтурава вяла перастрэлку ля вёскі Сцефанполь і вёскі Валынцы. 18 ліпеня ў сем гадзін апоўдні 1 Бугскі казачы полк есаула Жэкуля атакаваў французаў па дарозе з Чэрасаў на Дзісну. Пад час сутычкі заўрад-харунжы Даброў узяў у палон французскага ўлана. Падышоўшыя французскія часці адцяснілі Бугскі полк да Дзісны. 18 ліпеня ў данясенні Вітгенштэйна Барклаю дэ Толі сказана, што ля вёскі Узмены быў атакаваны французскі авангард і ўзяты ў палон чатыры гусары. “20 ліпеня адбыўся бой з французамі ля вёскі Пакаёўцы, ля Друі [7, с. 99]. Але найбольшыя страты панеслі французскія войскі не ад куль і ядраў гарматаў, а ад хваробаў. Пра гэта мы даведваемся з мемуараў “Напалеон: паход у Расію. 1812 год” маёра фон Каўслера трэцяй арміі Нэя. Яго шлях як раз і праходзіў праз нашы мясціны. Вось, што ён запісаў у сваім дзённіку за 18 ліпеня: “Дызентэрыя была настолькі моцнай, што салдаты падалі мёртвымі прама на маршы, або валіліся мёртвымі на біваку, без папярэднічаўшых прыкмет блізкай небяспекі. У нашай штаб-кватэры яна схапіла і ўнесла многіх…”. Пад час шматлікіх краязнаўчых вандровак у гутарках з мясцовымі жыхарамі шмат дзе сустракалі мясціны з назвай французскія могілкі, асабліва ля ваенных шляхоў, але не адзначаны ніякімі баямі, або сутычкамі, напрыклад, ля вёсак Дзінаўка, Запалоссе. Далей аўтар мемуараў апісвае цяжкасці руху па нашай мясцовасці. “Дарогі разбітыя бясконца доўгімі калонамі, ідучымі праз балоцістыя лясы па насцілах і барацьба паміж падраздзяленнямі розных родаў войск, бесперапынна даганяўшымі адсякаўшымі адзін другому і не ўтрымліваемыя армейскай паліцыяй, рабілі гэты марш найбольш сцяжарваючым. У такіх умовах, зусім знясіленыя, мы зрабілі 21 ліпеня справа ад дарогі, вядучай на Дзісну справа ад пылаючай вёскі”._25 ліпеня адбыўся бой гусар Кульнёва ля Лявонпаля. З жніўня ля горада Дзісна лятучы атрад генерал-маёра Рэпніна, зводны кірасірскі полк, чатыры эскадроны кавалергградскага палка яе вялікасці і яго вялікасці, двух батальёнаў егерскага палка з дзвюма лёгкімі гарматамі выступілі супраць французаў, разбілі іх, захапілі французскія склады і спалілі іх , знішчылі ў Дзісне мост праз Заходнюю Дзвіна. 22 жніўня, адшукаўшы брод праз Заходнюю Дзвіну непадалёку ад Дрысы, і пераправіўшыся ўплаў паручнік Варанцоў ля вёскі Грамоны разбіў кавалерыйскі атрад французаў, а пяхота схавалася ў лесе [7, с. 101–102]. Згодна загаду Вітгенштэйна супраць французскіх войск у верасні-кастрычніку на Мёршчыне вёў партызанскую барацьбу, сачыў за рухам войск Макдональда 24 полк Властава. Атрады гэтага палка дзейнічалі ля вёсак Перабродзе, Ніўнікі, ля мястэчка Мёры, Наўгароды і г.д. Адступаючыя ў канцы кастрычніка і лістападзе разрозненыя французскія часткі не ўступалі ў бой з рускімі войскамі. Адметнасць Мёршчыны была і ў тым, што тут адзначаны сутычкі мясцовага насельніцтва не толькі з французамі, але і рускімі .

Вайна прынесла Мёршчыне шматлікія разбурэнні і страты. Апынуўшыся ў цэнтры адступаючай рускай і наступаючай французскай армій, знішчалі і рабавалі маёмасць як французы,так і рускія. Так страты Браслаўскага павету, у які ўваходзіла частка Мёршчыны, склалі: людзей – 20 %, двароў – 15 %. Плошча пасеваў скарацілася на 37 %. Ад 50 – да 60 % скарацілася колькасць свіней, кароў, коней, авечак. Вялікія страты панеслі шляхецкія сядзібы. Так, найбагацейшы на Мёршчыне маёнтак Лапацінскіх у Лявонпалі панёс стратаў на 740 тысяч расійскіх рублёў. Спусташэнне прынеслі войскі корпуса Вітгенштэйна, які дзейнічаў тут найбольшы час. Так толькі пасеваў было патаптана 12 квадратных вёрстаў, высечана 5 вёрстаў лесу, спалена 53 сялянскія двары, жыхары якіх згінулі без следу.

Репозиторий ВГУ

Захоплена шмат жывёлы, знішчана мэбля і багацейшыя зборы мастацкіх каштоўнасцяў палаца [9, с. 157]. Вялікія страты панёс і маёнтак Забалоцце Міхаіла Дмахоўскага. Французы тут нарабавалі 40 пудоў жалеза, 25 – солі, па 20 пудоў вяндліны і сушанай рыбы,19 пудоў сала, 3 пуды тытуню, 1550 гарнцаў гарэлкі,140 гарнцаў піва, 240 гарнцаў мёду, а таксама некалькі сотняў гарнцаў воцату. У вялікай колькасці былі рабаваны сыры, масла, воск і інш. Французы прыхапілі таксама куфэркі, старыя стрэльбы, шаблі, гадзіннік, люстру, футру, мэблю, сталовае срэбра, бялізну, 2000 злотых пасаг для дачкі, старыя французскія віны, прадметы даўніны. Акрамя рабавання ўладальніка маёнтка, войскі не пашкадавалі і сядзібаў яго сялян. Бралі ўсё: хусткі, палатно, мяшкі, косы, вазы спалілі дзве адрыны, паздзіралі салому са стрэхаў, выламаны вокны, дзверы, паламаны і спалены агароджы, сады. Не засталося ў сялян ніводнай жывёлы. Страты, нанесеныя Забалоцкаму маёнтку арміяй Мюрата склалі 26 тысяч 636 рублей срэбрам, страты, нанесеныя рускім войскам – 21 тысячу 833 рублі [9, с 156 ]. Салдаты рабавалі не толькі жыхароў, але нават і святыні. Так, былі абрабаваны касцёлы ў Навалацы, Пагосце, Дзісне, Уваскрасенскі манастыр Як вобразна сказаў рускі генерал Армфелд: “Там, дзе прайшлі арміі нічога акрамя аваднёў і балот не засталося: пасевы вытаптаны, хаты зруйнаваны, быдла забрана, паўсюдна галеча, натоўпы дэзерціраў, трупы людзей і незлічоныя конскія трупы.” Страты, нанесеныя краю, адчувальнымі былі да сярэдзіны 19 стагоддзя, а падзеі вайны 1812 года захаваліся праз пакаленні людзей да сённяшняга часу.

Для аматараў вандровак па месцах, звязаных з гісторыяй падзей 1812 года мы распрацавалі веласіпедны трохдзённы турыстычна-краязнаўчы маршрут “Пярсцёнак вайны 1812 года”. Агульная працягласць маршрута 160 кіламетраў.


1. Гарин, Ф.А. Изгнание Наполеона / Ф.А. Гарин. – М., 1948. – С. 109.
2. Гарнич, Н.Ф. 1812 год / Н.Ф. Гарнич. – М., 1956. – С. 63–64.
3. Записки А.П. Ермолова, 1798–1826. – М., 1991. – С. 126–127.
4. Лукашевич, А. Укреплённый лагерь в стратегических планах Фуля: от абстрактной идеи до реализации в Дриссе (1811-1812) / А. Лукашевич // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2004. – № 1. – С. 43–44.
5. Полоцко-Витебская старина. – Вып. 3. – Витебск, 1916. – С. 281.
6. Отечественная война 1812. – э. Отд. 1. – Т. 11. – С. 44.
7. Поликарпов, Н.П. Боевой календарь-ежедневник Отечественной войны 1812 года / Н.П. Поликарпов. – Ч.1. – М., 1913. – С. 99–102.
8. Харкевич, В И. Война 1812 г. От Нёмана до Смоленска / В.И. Харкевич. – 1901. – С. 85.
9. Hedemann, O. Historia powiatu Braslawskiego / O. Hedemann. – Wilno, 1930. – С. 156–157.


**А.Ф. Самусик**

## СМОЛЕВИЧИ И ИХ ОКРЕСТНОСТИ В ПЕРИОД ВОЙНЫ 1812 ГОДА

Война 1812 года была отмечена рядом примечательных событий, которые послужили примером для дальнейшего развития и усовершенствования тактики ведения боевых действий.

Широкую известность получили стремительные манёвры крупных воинских подразделений и целых армий, стратегическое планирование широкомасштабных операций, кровопролитные сражения в условиях пересечённой местности, успешные действия многочисленных партизанских отрядов, долговременные осады хорошо защищённых опорных пунктов и крепостей. Именно в этих сложнейших приёмах ведения боевых операций проявился весь гений французского императора Наполеона I, а также противостоявших ему российских военачальников (М. Кутузова, П. Багратиона и пр.).

Репозиторий ВГУ